**Развіццё прафесійнай кампетэнтнасці настаўніка па выкарыстанні абласнога віртуальнага адукацыйнага рэсурса “Белы ветразь” на вучэбных прадметах “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”**

***Даўгулёва Ірына Аляксееўна,***
*старшы выкладчык кафедры педагогікі і прыватных методык*
*ДУА «Гомельскі абласны інстытут развіцця адукацыі»*

Сучасны педагог – гэта не проста настаўнік з добрымі ведамі па прадмеце, але і чалавек, які ўмее карыстацца разнастайнымі сродкамі навучання, добра ведае пошукавыя сістэмы інтэрнэта, валодае азамі сецявога ўзаемадзеяння і, увогуле, карыстаецца віртуальнымі інфармацыйнымі рэсурсамі пры падачы матэрыялу на сваіх уроках.

Выкарыстанне на ўроках камп’тарных сродкаў сёння з’яўляеецца неабходнасцю. Гэта аблягчае работу настаўніка, вучню дапамагае больш якасна і змястоўна засвоіць вывучаемы матэрыял. На ўроках мовы можна карыстацца на розных этапах презентацыямі, электроннымі даведнікамі, энцыклапедыямі, праграмамі-трэнажорамі, праграмнымі сістэмамі кантролю ведаў і г.д. Пры тлумачэнні новага матэрыялу буць карыснымі прэзентацыі, інфармацыйныя Інтэрнэт-сайты, інфармацыйныя рэсурсы на дысках, відэа- і аўдыёзапісы. Пры замацаванні навыкаў – навучальныя праграмы, трэнажоры, рэбусы, камп’ютарныя гульні, раздатачны матэрыял. На кантрольна-ацэначным этапе неабходнымі з’яўляюцца камп’ютарныя тэсты (адкрытыя, закрытыя), практыкаванні, крыжаванкі. На этапе самастойнай работы вучняў выкарыстоўваюцца электронныя энцыклапедыі, слоўнікі, даведнікі, табліцы.

На старонках абласнога віртуальнага адукацыйнага рэсурса па беларускай мове і літаратуры “Белы ветразь” змешчана вялікая колькасць спасылак на сайты і блогі, а таксама разнастайных карысных матэрыялаў, якія аблегчаць падрыхтоўку настаўніка да ўрокаў:

Сайт Нацыянальнай бібліятэкі https://www.nlb.by/
Сайт Нацыянальнага інстытута адукацыі http://adu.by/ru/
Сайт Міністэрства адукацыі http://edu.gov.by/
Сайт Гомельскага абласнога інстытута развіцця адукацыі http://iro.gomel.by/
Партал для настаўнікаў http://www.nastaunik.info/
Беларускія слоўнікі http://slounik.org/
Блог "Інтэрактыўныя гульні па беларускай мове і літаратуры" http://intgulni.blogspot.com.by/
Блог "Цікава пра мову" http://movahalch.blogspot.com.by/
Блог беларускіх прыказак http://belprykaz.blogspot.com.by/
Блог беларускіх загадак http://belzag.blogspot.com.by/
Казкі беларускія http://kazki.by/
Народныя казкі для дзетак http://kazki.unicef.by/
Беларуская палічка http://knihi.com/

Творы беларускай літаратуры http://znichka.ucoz.com/
Беларускія вершы http://vershy.ru/
Сайт “Родныя вобразы” http://rv-blr.com/
Вершы пра беларускую мову http://belmova.ru/
Вершы пра Беларусь http://sinyavokaya.ru/
Вершы пра знакамітых беларусаў http://belarusy.net/
Саюз пісьменнікаў Беларусі http://www.oo-spb.by/
Саюз беларускіх пісьменнікаў http://lit-bel.org/
Літаратурны музей Максіма Багдановіча http://bagdanovich.museum.by/
Літаратурны музей Янкі Купалы http://kupala-museum.by/
Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа http://yakubkolas.by/
Сайт газеты “Літаратура і мастацтва” www.lim.by
Сайт часопіса “Дзеяслоў” http://dziejaslou.by/
Сайт часопіса “Полымя” http://zviazda.by/be/edition/polymya
Сайт часопіса “Маладосць” http://zviazda.by/be/edition/maladosc
Сайт часопіса “Роднае слова” http://rod-slova.by/
Сайт часопіса "Народная асвета" https://www.n-asveta.by/
Нацыянальны мастацкі музей Беларусі http://www.artmuseum.by
Нацыянальны гістарычны музей Беларусі http://histmuseum.by/by/
Сайты настаўнікаў Гомельшчыны:
Блог Ірыны Казачэнкі https://presentdaymova.wordpress.com/
Навучальны дапаможнік Бедняковай Ірыны “Сіняя птушка” https://sites.google.com/view/ptushka/
Сайт настаўніка беларускай мовы і літаратуры Мігаль Алены http://migalayte.ucoz.ru/

Так пры паўтарэнні тэмы “Арфаграфія” ў 10-м класе можна прапанаваць наступныя заданні:

1. выкарыстоўваючы дадзеную спасылку http://www.nastaunik.info/search/node/%D1%82%D1%80%D1%8D%D0%BD%D0%B0%D0%B6%D0%BE%D1%80 знайсці і пазнаёміцца з арфаграфічным трэнажорам “Беларускі калейдаскоп”;

2. зашыфраваць у выглядзеце гексаў сімвалы беларускага арнаменту, пазначанага на раздзелах “Беларускага калейдаскопа” і патлумачыць;

3. працуючы з трэнажорам па правіле “Правапіс е, ё, я” выпісаць па 4 словы, якія адпавядаюць адметным з’явам беларускага маўлення (дзеканне, цеканне) і патлумачыць асаблівасці гучання і напісання гэтых слоў.

Пры вывучэнні тэмы “Фразеалогія” на экран можна вывесці тэкст, даць магчымасць вучням азнаёміцца з ім і паспрабаваць патлумачыць паходжанне фразеалагізма *вомегам вылазіць*.

*Беларускі фразеалагізм вомегам вылазіць ужываецца са значэннем “адпомсціцца, не праходзіць бясследна”, калі кажуць пра расплату за які-небудзь кепскі ўчынак.*

*Паходжанне фразеалагізма становіцца зразумелым, калі высветліць сэнс яго першага кампанента. Вомег – другая назва балігалову, двухгадовай расліны з сям’і парасонавых. Пра страшэннай сілы яд, выціснуты з вомегу, ведалі яшчэ*

*ў Старажытнай Грэцыі і карысталіся ім для знішчэння палітычных сапернікаў. Вядома, напрыклад, што філосаф Сакрат быў атручаны вомегам. Лісты і плады вомегу, калі трапяць у ежу, выклікаюць атручванне, знешнім паказчыкам якога з'яўляюцца ваніты…* (Паводле І. Лепешава).

Пасля тлумачэння прапанаваць знайсці ў тэксце словы, напісанне якіх можа выклікаць цяжкасці, вусна патлумачыць іх правапіс. А далей, карыстаючыся электроннай энцыклапедыяй (раздзел **Кнігі – Слоўнікі і дапаможнікі – Беларуская энцыклапедыя**) праверыць напісанне гэтых слоў у online рэжыме. Дадому можна прапанаваць наступнае заданне: карыстаючыся пошукавымі сістэмамі інтэрнэту, знайсці цікавыя звесткі пра вомег, або балігалоў. Запісаць тэкст. Вызначыць у тэксце ўсе вывучаныя раней арфаграмы. Такі падыход будзе матываваць вучняў да зацікаўленасці прадметам, акрамя таго, на ўроку будзе створана адзіная тэматычная прастора. Знайсці такія пазнавальныя тэксты пра этымалогію паходжання фразеалагізмаў можна ў электронным варыянце слоўніка, змешчанага ў раздзеле **Кнігі – Слоўнікі і дапаможнікі – Фразеалагічныя –** Этымалагічны слоўнік фразеалагізмаў (І. Лепешаў).

Карысныя парады, цікавыя падыходы можна знайсці на сайтах і блогах настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры. Так у раздзеле **З вопыту работы** Пятроўская Вольга прапануе азнаёміцца са сваёй работай "Выкарыстанне сістэмы практыкаванняў на ўроках беларускай мовы для фарміравання маўленчай і камунікатыўнай кампетэнцый вучняў". Беднякова Ірына дзеліцца вопытам стварэння глог-плакатаў для ўрокаў беларускай літаратуры.

У раздзеле **Прымяненне Web 2.**0 пададзены спіс гэтых рэсурсаў і шаблоны стварэння гульняў, картак, флаераў, віктарын, рэбусаў і г.д. Напрыклад: выкарыстоўваючы памятку і рэсурс https://learningapps.org/ стварыць для навучэнцаў 7 класа інтэрактыўнае заданне па тэме "Трыванне дзеясловаў".

У раздзеле **Прымяненне QR-кодаў** для настаўнікаў размешчана электронная Памятка "Як прачытаць і стварыць QR-код". Улічваючы матэрыялы падручнікаў новага пакалення па вучэбных прадметах "Беларуская мова" і "Беларуская літаратура" з навігацыйнай функцыяй, настаўнікі павінны навучыцца карыстацца спасылкамі на рэсурс аддаленага доступу з выкарыстанне QR-кодаў.

Раздзел **Інфармацыйныя рэсурсы** дае магчымасць настаўнікам і вучням на ўроках, пазакласных мерапрыемствах, не пакідаючы рабочага месца заглянуць на сайт Саюза пісьменнікаў Беларусі http://www.oo-spb.by/ або сайт маладзёжнага гутра Naviband https://naviband.by/, пацікавіцца навінкамі літаратуры на старонках газеты "Літаратура і мастацтва" www.lim.by, наведаць у online рэжыме Дзяржаўны мемарыяльны комплекс "Хатынь" www.khatyn.by, віртуальна пахадзіць па залах Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь https://www.nlb.by/, наведаць прэм'еру "Паўлінка" на сайце тэатра імя Янкі Купалы https://kupalauski.by.